

# Будуецца трэці калійны

Непадалёку ад прамысловых пляцовак першага і другога Салігорскіх калійных камбінатаў узняліся ўверх буравыя вышкі, ваколіцы напоўніліся рокатам матораў. Пачалося будаўніцтва новага гіганта вялікай хіміі рэспублікі — трэцяга калійнага камбіната.

З будаўнічай пляцоўкі яшчэ не пайшлі геолагаразведчыкі. Яны працягваюць бурыць кантрольныя шчыліны, а побач з імі мантажнікі вядуць мантаж буравых помпаў і вышак. Тут жа працуюць і электразваршчыкі. Яны рыхтуюць трубы для замарожваючых шчылін.

На пляцоўку кожны дзень паступаюць будаўнічыя матэрыялы, рознае абсталяванне. На падсобныя аб'екты падводзіцца лінія электраперадачы.

НА ЗДЫМКУ: мантаж буравой вышкі для ствала № 1.

Фотахроніка БЕЛТА